***І. М. АЎЛАСЕНКА***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Беларусь; avlasenkim@bsu.by*

# ДЫПЛАМАТЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ССР ПРАЗ ПОГЛЯД ПІСЬМЕННІКАЎ

*У артыкуле прапануецца выкарыстоўваць дакументы асабістага паходжання беларускіх літаратараў для рэканструкцыі гісторыі беларускай дыпламатыі савецкага перыяду. Пералічаны найбольш інфарматыўныя крыніцы на гэтую тэму са спадчыны паэтаў і празаікаў. Зроблена выснова аб тым, што выкарыстанне крыніц такога тыпу таксама дапамагае раскрыць асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў рэспубліцы і закранае гісторыю паўсядзённасці савецкай Беларусі. Творчая спадчына і крыніцы асабістага паходжання беларускіх пісьменнікаў (мемуары, дзённікавыя запісы, лісты) даюць магчымасць прасачыць не толькі афіцыйны бок работы дэлегацыі БССР у ААН, але і побыт, унутраную псіхалагічную атмасферу, нефармальныя ўзаемасувязі, якія цяжка аднавіць паводле афіцыйных матэрыялаў. Знаёмства з гэтымі аспектамі дазваляе дакладней раскрыць вытокі сённяшняй дыпламатыі Рэспублікі Беларусь.*

***Ключавыя словы:*** *пісьменнік; паэт; дыпламатыя; Беларуская ССР; Арганізацыя Аб'яднаных Нацый; Генеральная Асамблея; «халодная вайна».*

***I. M. AULASENKA***

*Belarusian State University; Nezavisimosti ave., 4,*
*220030, Minsk, Belarus; avlasenkim@bsu.by*

# DIPLOMACY OF THE BYELORUSSIAN SSR THROUGH THE EYES OF WRITERS

*The usage of the personal documents of the Belarusian writers to reconstruct the history of Belarusian diplomacy of the Soviet period is proposed in the paper. The most informative sources on this subject from the heritage of poets and prose writers are mentioned. It was concluded that the use of sources of this type also helps to reveal the peculiarities of the socio-political life in the republic and covers the history of everyday life of the Soviet Belarus. Creative heritage and sources of personal origin of Belarusian writers (memoirs, diaries, letters) make it possible to trace not only the official side of the activity of the delegation from the Byelorussian SSR to the United Nations, but also*

*everyday life, inner psychological atmosphere, informal relationships that are difficult to uncover by using only official documents. These aspects allow to uncover the origins of modern diplomacy of the Republic of Belarus more efficiently.*

***Keywords:*** *writer; poet; literature; diplomacy; Byelorussian SSR; Organization of the United Nations; General Assembly; Cold War.*

Гісторыя знешнепалітычнай дзейнасці БССР з'яўляецца актуальным кірункам у айчыннай гістарыяграфіі, якая патрабуе далейшага вывучэння. У савецкі час значны ўклад у распрацоўку гэтай навуковай праблемы ўнеслі С. Д. Вайтовіч, Н. С. Варабей, А. Е. Гурыновіч, Л. У. Языковіч і шэраг іншых даследчыкаў [1–4]. Ахопліваючы даволі шырокі пласт навуковых праблем, тым не менш, іх працы былі заснаваныя галоўным чынам на афіцыйных дакументах і апублікаваных крыніцах. З набыццём незалежнасці Рэспублікі Беларусь узніклі навуковыя працы, створаныя на падставе архіўных дакументаў і новых метадалагічных падыходаў. У гэтым шэрагу варта ўзгадаць манаграфіі У. Е. Снапкоўскага «Путь Беларуси в ООН: 1944–1945 гг.», «Знешнепалітычная дзейнасць БССР (1945–1953 гг.)», у якіх у навуковы абарот быў уведзены шэраг новых крыніц, у тым ліку і англамоўных [5; 6]. Грунтоўнасцю, заснаванасцю на шырокім комплексе архіўных дакументаў вызначаецца манаграфія С. Ф. Свілас «Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО (1954–1964 гг.)» [7]. Тым не менш праблема ўдзелу Беларускай ССР у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і яе спецыялізаваных установах настолькі шырокая, што і сёння застаецца шмат нераспрацаваных аспектаў. Звязана гэта і з тым, што шэраг архіўных матэрыялаў і на сённяшні час з'яўляецца для даследчыкаў закрытым.

З гэтай прычыны прадуктыўным прадстаўляецца вывучэнне гісторыі беларускай дыпламатыі праз крыніцы асабістага паходжання. Сярод крыніц такога кшталту варта ўзгадаць мемуары К. В. Кісялёва, В. С. Смірнова [8; 9]. У 2018 г. выйшла дакументальная кніга пра К. Т. Мазурава «Кирилл Мазуров. О чем молчало время...», дзе асобны раздзел адведзены і ўдзелу першага сакратара ЦК КП(б)Б у знешнепалітычнай дзейнасці БССР [10]. Разам з тым багатае поле для даследчыкаў прадстаўляе спадчына беларускіх літаратараў, якія таксама прымалі ўдзел у знешнепалітычнай дзейнасці БССР.

Нароўні з афіцыйнай дыпламатыяй важнае месца ў знешнепалітычнай дзейнасці БССР займала народная дыпламатыя. Адметную ролю ў ёй адыгрывалі грамадскія дзеячы, прадстаўнікі інтэлігенцыі: пісьменнікі, мастакі, кампазітары. Каардынацыя іх удзелу

адбывалася праз беларускае аддзяленне Усесаюзнага таварыства культурных сувязей з замежжам, якое ў 1958 г. было рэарганізавана ў Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі. У прыватнасці, прадстаўнікі беларускай савецкай інтэлігенцыі прынялі актыўны ўдзел у руху за мір. Так, у 1949 г. паэт Максім Танк наведаў Першы сусветны кангрэс прыхільнікаў міру ў Празе. А ў 1951 г. быў створаны Беларускі рэспубліканскі камітэт абароны міру, старшынямі якога неаднаразова станавіліся беларускія літаратары – Якуб Колас, Аркадзь Куляшоў, Іван Мележ, Пімен Панчанка. Народная дыпламатыя БССР – цікавы феномен, якому ўжо быў прысвечаны шэраг навуковых работ. Сярод іх варта адзначыць манаграфію В. Г. Шадурскага «Культурныя сувязі Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы (1945–1990-я гг.)», якая стала асновай для абароны дысертацыі на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук [11]. Прадмет гэтага даследавання ахапіў толькі стасункі БССР з еўрапейскімі краінамі.

Разам з тым існаваў і адваротны феномен: работнікі сферы літаратуры і мастацтва ўключаліся ў склад афіцыйных дэлегацый БССР. Так, пісьменнік Міхась Лынькоў і скульптар Заір Азгур прымалі ўдзел у афіцыйных дэлегацыях БССР на Генеральных канферэнцыях ЮНЕСКА (адпаведна ў 1956 і 1980 гг.). Такая форма задзейнічання прадстаўнікоў інтэлігенцыі падкрэслівала цесную сувязь паміж афіцыйнай і грамадскай дыпламатыяй Беларускай ССР. Тры беларускія літаратары – Максім Танк, Іван Шамякін, Іван Навуменка – узначальвалі Вярхоўны Савет БССР з 1965 па 1990 гг. З 1945 па 1990 гг. беларускія літаратары амаль штогод прымалі ўдзел у сесіях Генеральнай Асамблеі ААН. У якасці паўнамоцных членаў дэлегацый БССР у Злучаных Штатах пабывалі 29 паэтаў і празаікаў.

Многія аспекты ўдзелу беларускіх пісьменнікаў у дыпламатычнай дзейнасці Беларускай ССР амаль не атрымалі асвятлення ў гістарыяграфіі дагэтуль. У прыватнасці, не атрымала падрабязнага асвятлення тэма ўдзелу беларускіх пісьменнікаў у сесіях Генеральнай Асамблеі ААН. Асобныя моманты разгледжаныя філолагамі, якія даследавалі жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, але гэтыя працы носяць літаратуразнаўчы характар, не закранаюць гісторыю ўласна дыпламатыі БССР. Нарысы ці крыніцы асабістага паходжання беларускіх літаратараў, што тычыліся ўдзелу ў рабоце Генеральнай Асамблеі ААН, амаль ніколі не станавіліся прадметам асобных гістарычных даследаванняў.

Галоўнай прычынай такой сітуацыі бачыцца тое, што ўдзел беларускіх пісьменнікаў у дыпламатыі БССР як прадмет навуковага даследавання знаходзіцца на мяжы паміж гісторыяй і філалогіяй і лічыцца «нічыйнай» тэрыторыяй (у навуковым сэнсе). Даследаванне гэтай праблемы патрабуе міждысцыплінарнага падыходу. Разам з тым сама тэма мае значны эўрыстычны патэнцыял для дальнейшых даследаванняў у гісторыі беларускай дыпламатыі, бо дазваляе ўвесці ў зварот шэраг новых крыніц і разгледзець яе з новага ракурсу – як гісторыю паўсядзённасці беларускай дыпламатыі. У адрозненне ад мемуарнай спадчыны прафесійных дыпламатаў, крыніцы асабістага паходжання літаратараў больш разнастайныя і вызначаюцца мастацкім багаццем. З прычыны таго, што паэты і пісьменнікі ў большасці сваёй не з'яўляліся прафесійнымі чыноўнікамі, іх ацэнкі і назіранні адрозніваліся большай адкрытасцю і свежасцю.

Крыніцамі, якія найбольш поўна ўвабралі ў сябе назіранні беларускіх пісьменнікаў, з'яўляюцца дзённікавыя запісы, успаміны, эпісталярная спадчына. Найбольш інфарматыўныя ў гэтым сэнсе дзённікі і лісты Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, мемуары Івана Шамякіна, Максіма Танка [12–15]. Сярод нарысаў, апублікаваных у беларускім савецкім друку, найбольш дэталёвымі з'яўляліся творы Міхася Лынькова, Максіма Танка, Івана Шамякіна, Кастуся Кірэенкі, Анатоля Вярцінскага, Барыса Сачанкі. Як крыніцы асабістага паходжання, так і нарысы, вершы, апавяданні неслі на сабе адбітак светапогляду савецкага чалавека, таму з'яўляюцца цікавай гістарычнай крыніцай, дазваляючы звязаць гісторыю дыпламатыі з гісторыяй паўсядзённасці беларускага савецкага грамадства.

Такім чынам, знаёмства з удзелам беларускіх пісьменнікаў у знешнепалітычнай дзейнасці БССР, у прыватнасці ў рабоце на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН, не толькі дазваляе прыадкрыць адну са старонак з гісторыі дыпламатыі БССР. Дзякуючы міждысцыплінарнаму характару гэтая тэма таксама дапамагае раскрыць асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў рэспубліцы і закранае гісторыю паўсядзённасці савецкай Беларусі. Творчая спадчына і крыніцы асабістага паходжання беларускіх пісьменнікаў (мемуары, дзённікавыя запісы, лісты) даюць магчымасць прасачыць не толькі афіцыйны бок работы дэлегацыі БССР у ААН, але і побыт, унутраную псіхалагічную атмасферу, нефармальныя ўзаемасувязі, якія цяжка аднавіць паводле афіцыйных матэрыялаў. Знаёмства з гэтымі аспектамі дазваляе дакладней раскрыць вытокі сённяшняй дыпламатыі Рэспублікі Беларусь.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Войтович С. Д., Воробей Н. С., Толстой В. С.* Сотрудничество Белорусской ССР с социалистическими странами. Минск : Навука і тэхніка, 1970.

2. *Воробей Н. С.* Участие Белорусской ССР в отношениях Советского Союза с капиталистическими странами (50–70-е гг.) / науч. ред. П. Т. Петриков. Минск : Навука і тэхніка, 1981.

3. *Гуринович А. Е.* Участие Белорусской ССР в деятельности ООН. Минск : Беларусь, 1982.

4. *Языкович Л. В.* Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО Минск : Навука і тэхніка, 1986.

5. *Снапковский В. Е.* Путь Беларуси в ООН: 1944–1945 гг. / под ред. А. С. Протопопова. Минск : Навука і тэхніка, 1994.

6. *Снапкоўскі У. Е.* Знешнепалітычная дзейнасць БССР (1945–1953 гг.). Мінск : Беларус. навука, 1997.

7. *Свилас С. Ф.* Деятельность Белорусской ССР в ЮНЕСКО (1954–1964 гг.). Минск : БГУ, 2013.

8. *Киселёв К. В.* Записки советского дипломата. М. : Политиздат, 1974.

9. *Смирнов В. С.* Беларусь в Совбезе ООН: воспоминания белорусского посла // Беларус. думка. 2011. № 1. С. 64–71.

10. *Голубева Н. А.* Кирилл Мазуров. О чем молчало время… . Минск : Беларус. энцыкл., 2018.

11. *Шадурский В. Г.* Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990-е гг.). Минск : БГУ, 2000.

12. *Барадулін Р. І.* Дзённікі і запісы. Вып. 4 : 1983–1988 / [заўвагі: Н. Давыдзенка, І. Сляповіч]. Мінск, 2017.

13. *Танк М.* Збор твораў. Т. 10 : Дзённікі (1960–1994) / [уклад.: У. І. Мархель, С. У. Калядка]. Мінск, 2010.

14. *Танк М.* Збор твораў. Т. 12 : Лісты / [уклад.: У. І. Мархель, С. У. Калядка]. Мінск, 2011.

15. *Шамякін І. П.* Роздум на апошнім перагоне. Дзённікі 1980–1995 гг. Мінск : Маст. літ., 1998.